№195 (2008)
Субота, 16 кастрычніка 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец: УП «Народная воля».
Кошт свабодны.

Народная Воля

E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +4...+6, без ападкаў, уначы — +5...+7, дождж; у Брэсце ўдзень — +9...+11, без ападкаў, уначы — +10...+12, дождж; у Гродне ўдзень — +7...+9, без ападкаў, уначы — +8...+10, дождж; у Віцебску ўдзень — +3...+5, уначы — +4...+6, на працягу сутак — без ападкаў; у Гомелі ўдзень — +7...+9, уначы — +5...+7, на працягу сутак — без ападкаў; у Магілёве ўдзень — +5...+7, уначы — +4...+6, на працягу сутак — без ападкаў.

www.meteo.by

ОБРАЩЕНИЕ

Защитим себя!

Уже давно над гражданами Беларуси так не издевались, как последние 10 лет. Людей арестовывают, месяцами без суда держат в тюрьмах, выгоняют с работы или вообще они пропадают. Белорусский народ разделен на "плохих" и "хороших", на врагов и слуг. Нас толкают к конфронтации и гражданской войне, призывая "не оставить камня на камне от оппозиции".

10 лет белорусская оппозиция применяла ненасильственные методы борьбы с диктатурой. Мы призывали и призываем наших сторонников сохранять достоинство и здравый рассудок перед обезумевшими от ненависти представителями власти. Особенно теперь, когда требуется огромное мужество и душевные силы для защиты гражданских свобод в Беларуси.

Мы отстоим, мы должны отстоять свои права, отстоять во имя будущего своих детей и внуков.

Для тех, кто верит, что Лукашенко будет править вечно, или надеется, что при новой власти все-таки удастся избежать ответственности **за издевательства** над людьми и **преступления,** сообщаем: ни один факт нарушения закона не останется без внимания, ни один участник **внезаконных** расправ над гражданами Беларуси не уйдет от ответственности.

Известные люди, общественные деятели нашей страны приняли совместное решение о создании **Комитета защиты граждан.** Всех, кто стал жертвой или свидетелем беззакония со стороны представителей власти, мы призываем сообщать об этом в Комитет. Сообщите нам фамилии следователей, которые проводили **незаконные** обыски, прокуроров, которые выдали незаконные санкции на аресты, судей и чиновников, **издевавшихся** над людьми. Рано или поздно Беларусь станет свободной европейской страной и всех нарушителей Конституции и закона накажут. Срока давности по делам о политических репрессиях и преступлениях против человечности нет! Никто не будет забыт и ничто не останется без ответа.

Информация о каждом нарушении закона и обо всех участниках этого беззакония будет проверяться, сводиться в общий список, затем публиковаться в средствах массовой информации и передаваться в международные организации и посольства.

Александр БУХВОСТОВ, председатель ликвидированной Белорусской партии труда;
Винцук ВЕЧЕРКО, председатель Партии БНФ;
Анатолий ЛЕБЕДЬКО, вице-спикер Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва;
Сергей КАЛЯКИН, член Президиума Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва;
Анатолий ПАВЛОВ, проректор Белорусского государственного университета 1995—1997 гг.;
Валерий ФРОЛОВ, депутат Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь.

РОК ЗА СВОБОДУ

Музыканты запустили «Бумеранг»

В пятницу в Минске музыканты запрещенных в Беларуси рок-групп презентовали свой новый альбом "Бумеранг". Деньги на альбом собирали люди неравнодушные и преданные своей стране. Каждый — сколько мог. И альбом все-таки появился.

По словам лидера группы "Палац" Олега Хоменко — это лучший белорусский альбом за последние несколько лет. В нем свои лучшие произведения представили звезды, группы известные и в каком-то смысле культовые - "N.R.M.", "Нейро Дюбель", "Палац", "Крама" и др. Это все те, кто 21 июля осмелился принять участие в акции оппозиции по подведению итогов 10-летия правления Александра Лукашенко. Как известно, власти ответили на это музыкантам введением запрета на профессию.

Напомним, что первыми поддержали белорусских коллег "наутилус" русскоязычного рока Вячеслав Бутусов, выступивший в Минске со специальным концертом. Сейчас — новая акция в рамках движения "Рок за свободу".

Елена НОВИКОВА.

ИЗ ПИСЬМА ЧИТАТЕЛЕЙ

Пусть возглавит какой-нибудь отстающий колхоз

Все, что сделано за последние 10 лет, сделано не одним Лукашенко. Работал весь народ, вся Беларусь. Сделано много еще до Лукашенки, но еще больше предстоит сделать.

Пусть Лукашенко, отбыв свой срок, уступит место новому президенту, а сам возглавит какой-либо отстающий колхоз (такие есть), поднимет его и докажет свою силу.

Иван ШИМАНСКИЙ, житель Минска.

Вячеслав Оргиш,
доктор философских наук

Если смотреть в корень,

или О том, почему г-н Кулаковский не тянет на Нобелевскую премию

Слушая или читая откровения наших высокопоставленных чиновников, не перестаешь удивляться их простоте (правда, в народе ее называют по-другому). Впрочем, возможно, и не простота это вовсе, а обычная демонстрация преданности вождю, его идее (или то и другое вместе).

Установить точный диагноз трудно. Тем не менее то, что многие наши служители "вертикали" способны и готовы, ни капли не краснея, перевертывать действительность, выдавать черное за белое и наоборот, остается фактом. В этом они неподражаемы и даже не боятся соревноваться с главным вещателем белорусских "успехов".

Один из самых ярких примеров такого рода перевертывания действительности подал 6 октября Юрий Кулаковский, помощник президента, главный инспектор по Могилевской области. В его интервью флагману государственной прессы раскрываются просто-таки грандиозные (сравнимые разве что с китайским "чудом") успехи белорусской экономики. И с ходу анализируются "глубинные" причины такого успеха. Инспектор (на то он и инспектор) попадает в самую десятку. "Если задуматься, посмотреть в корень, — доверительно сообщает он, — поймешь: не будь поручений Александра Григорьевича (и, соответственно, строгого их выполнения), ряда важнейших объектов могло вообще не появиться". А несколько ниже делает редкое по глубине аналитическое наблюдение: "Если говорить об экономике, президент держит под личным контролем наиболее важные отрасли. Он, например, неоднократно побывал на могилевской фабрике "Химволокно", заводах им. Кирова, искусственного волокна, "Трансмаше", в Бобруйске на "Белшине" и "Фандоке". В результате градообразующие предприятия получили различные преференции и льготы, что дало им возможность развиваться".

Что на это сказать!? Потрясающая сила экономической интуиции! Маркс, Мизес, Хайек и прочие светила экономической мысли могли бы позавидовать г-ну Кулаковскому. Возможно, даже президентскому помощнику могла бы светить Нобелевская премия. Если, конечно, Нобелевский комитет и просвещенная Европа поверят главному его "открытию" о том, что "за последние 10 лет наша страна сильно изменилась в лучшую сторону".

Лично я не верю. Более того, убежден в том, что экономический и политический курс Беларуси, проводимый патроном г-на Кулаковского, толкает страну в тупик. Все разговоры о "бурном" и "неуклонном" росте белорусского производства — не более чем сказки для дураков, густо приправленные лукавыми цифрами.

Разумеется, г-н Кулаковский и все, кто плечом к плечу с ним защищает курс "вождя", вправе сказать: кто ты такой, чтобы слушать тебя? Нет, мы тебя не желаем слушать, ибо твой голос постоянно раздается среди тех, кто все время норовит оспорить деяния "светлейшего", развенчать его политику.

Правильно, господа, не слушайте меня. Слушайте только тех, к кому испытываете доверие, слушайте своих, с кем хлебаете из одного котла. Давайте послушаем их голос, аккумулированный в государственной статистике и правительственных документах, вместе. Заодно пусть послушают их многочисленные доверчивые граждане, которым вы денно и нощно внушаете, что в государстве нашем все ладно и прекрасно.

Для начала кое-что о пресловутой "белорусской" модели экономического развития. Государственная статистика сообщает нам о том, что белорусская экономика затратна сверх всякой меры и, следовательно, нерентабельна. **Стоимость ресурсов в каждом рубле ВВП составляет 65—68 копеек. Это в два, а то и три раза превышает аналогичные показатели в странах, где по-настоящему высокоразвитая экономика.**

Можно и нужно ругать белорусскую статистику за то, что она не выдерживает международных стандартов, на заводах и фабриках начальники то и дело портят отчетность приписками и так далее. Но эти приписки, как правило, направлены на то, чтобы приукрасить, а не преуменьшить реальное положение дел. С учетом данного обстоятельства ситуация с ресурсозатратами белорусского производства, надо полагать, еще горше.

Теперь послушаем, какую оценку бурному "росту" белорусской экономики дают премьер-министр и министры белорусского правительства, которые не далее как в марте 2004 года приняли правительственную Концепцию национальной продовольственной безопасности Республики Беларусь. Из этого документа следует, что производство особо важных продуктов в натуральном выражении, если сравнивать с 1990 годом, упало в три раза. В 1990 году месячная покупательская способность по мясным продуктам в расчете на душу населения составляла 100 кг. В 1995 году этот показатель снизился до 28 кг., в 2001 году — до 16 кг. *"На 1 июня 2003 года, — подчеркивается в правительственном документе, — сбалансированное питание по рекомендуемым медицинским нормам при расходе на продовольствие 35 процентов в республике было доступно группам населения с уровнем доходов 480 тыс. рублей в месяц".*

Ну-ка, г-н инспектор сотоварищи, прикиньте, наберется среди десяти миллионов белорусов хотя бы два миллиона тех, кто имеет месячный душевой доход, близкий к 480 тыс. рублей? Едва ли.

Этот же правительственный документ невольно выносит компетентный приговор тем, кто вместе с главным вещателем надувает щеки по поводу неудержимого экономического роста в стране. *"Затянувшийся кризис экономики, — констатируют авторы правительственной концепции, — стал основной причиной снижения жизненного уровня населения и внутреннего производства продуктов питания".*

Спрашивается, в какую сторону все же сильно изменилась страна за десять лет? Даже казенные экономисты, щедро окармливаемые властью, нередко проговариваются на этот счет вполне определенно. Декларируемая ориентация белорусского государства на социальные нужды населения и у них вызывает скептическую реакцию.

Откройте отчеты государственного статистического ведомства за последние годы и вы увидите удручающую картину. Смертность населения Беларуси стабильно выше рождаемости. Пьянство и алкоголизм приняли массовый характер. Потребление спиртного сегодня составляет почти 10 литров на человека (в 1995 году этот показатель был 6, 7 литра). Количество неполных семей выросло с 10,3% (1990 год) до 14,4 (1999 год). Полистайте национальные отчеты (вполне официальные) и вы обнаружите, что почти две пятых населения страны (около четырех млн. человек) существует за чертой бедности.

Получается, для людей, если верить Минстату (а не верить ему нельзя), мало пользы в том, что "президент держит под личным контролем наиболее важные отрасли", ибо так называемый "стремительный" рост ВВП серьезно не сказывается на доходах населения. В 2003 году средняя семья получала где-то около 103 долларов, пенсионеры — около 37 долларов. Средняя зарплата в прошлом году составила 125, 5 доллара, в нынешнем году разговоры ведутся о 150 — 170 долларах.

Согласно тому же Минстату, большая часть семей (45%) не в состоянии самостоятельно справиться с материальными проблемами и вынуждены получать помощь от родственников приблизительно в размере 16 долларов. При этом в 2003 году число семей, получающих государственные пособия, сократилось с 23 % до 19, 1 %. Какой логикой социальной защиты своих граждан руководствовалось государство, когда принимало решение о таком сокращении? Может быть, г-н помощник президента сумеет разъяснить?

Белорусы сегодня выживают благодаря своему трудолюбию и ясному пониманию того, что власть не накормит, если сам себя не накормишь. В это трудно поверить, но 93, 6 % наших семей добывают пропитание, работая на личных подсобных хозяйствах. Согласно исследованиям Министерства статистики, примерно 21 доллар в месяц приносит в семейный бюджет дача, огород, домашнее хозяйство. Для пенсионеров это почти треть их пенсии.

Какой толк в том, что "президент держит под личным контролем наиболее важные отрасли", в стране неуклонно растет число граждан, вынужденных тратить последние сбережения на текущие нужды. Статистическое ведомство (а не какая-нибудь оппозиционная газета) сообщает просто-таки удручающие данные: в 2002 году 28, 7 % семей, чтобы как-то свести концы с концами, тратили свои накопления на текущее потребление, а в 2003 году количество таких семей выросло до 37, 8 %.

Если называть вещи своими именами, то следует говорить не о сильных изменениях в лучшую сторону за последние 10 лет, а об усилении реакционного социально-экономического курса белорусского руководства. Политика удушения частного предпринимательства, методично реализуемая все последние годы, приводит к тому, что капитал концентрируется в руках тех, кто имеет административно-государственную "крышу", но не умеет эффективно распоряжаться накопленным ресурсом. В результате капитализм в Беларуси не исчезает, а приобретает все более уродливые черты, рынок теряет свойства регулятора экономических отношений, хозяйственная деятельность носит не рациональный (не оптимальный) характер.

На весну 2004 года произведенная, но непроданная продукция исчислялась 1, 5 трлн. рублей. Неденежные расчеты во внутренних расчетах на начало года составляли почти 20 %. Задолженность по налогам растет, налоговый пресс, несмотря на "высочайшие" обещания, не слабеет, а усиливается. За январь — февраль 2004 года он вырос на 1 % и составил 35, 9 % (без учета фонда социальной защиты и инновационных фондов).

Убыточность белорусских предприятий не выдерживает никаких сравнений, на начало года их было 44 %. Поэтому различные преференции и льготы, которые, как сообщает г-н инспектор, отдельные из них выторговывают у главного чиновника страны, общую картину хозяйственного кризиса выправить никак не могут. В сельском хозяйстве рентабельность уже давно со знаком минус, задолженность сельхозпредприятий по кредитам на февраль 2004 составила 14, 3 трлн. рублей. Просроченная задолженность по банковским кредитам и займам только за январь увеличилась на 41, 3 % (на февраль 2004 года она составила 354 млрд. рублей).

Г-н Кулаковский особенно умиляется помощью своего патрона "со строительством моста через Березину в Бобруйске, который возводили 11 лет". А известно ли г-ну инспектору, что строительная политика белорусской власти обернулась тем, что в незавершенных объектах строительства заморожено около 12—13% ВВП? Такого рода расточительность не встретишь даже в самых бестолковых экономиках мира. Личный командный метод управления народным хозяйством, который навязан Беларуси А.Лукашенко, не решает многочисленных экономических проблем страны, а только усугубляет их и затушевывает. Что толку для экономики в целом, если глава государства волевым решением выделил ресурсы на завершение одного долгостроя, а сотни, тысячи других — остаются. История с мостом через Березину как раз хорошо иллюстрирует истину, которую ни г-н Кулаковский, ни его патрон не желают признавать. Белорусский народ мог бы жить намного зажиточнее, если бы работали в экономике страны рыночные механизмы, не господствовали в ней административные способы распределения ресурсов.

Вот и получается в итоге, что прошедшее десятилетие авторитарного правления в стране, о котором по простоте душевной (или по какой другой причине) с таким восторгом вещал в интервью г-н Кулаковский, на поверку оказывается десятилетием экономической стагнации и упущенной национальной выгоды.

Даешь рейтинг!

Беларусь рассматривает возможность прямого выхода на международные рейтинговые агентства для получения странового кредитного рейтинга. По словам министра финансов Николая Корбута, "возможность такая есть. В настоящее время мы работаем над уточнением этих подходов".

Мария ФЕДОРОВА

Как известно, представители белорусского правительства уже достаточно давно говорят о планах по получению странового кредитного рейтинга. Он необходим, в частности, для получения более дешевых кредитных ресурсов за рубежом, а также для работы на внешних фондовых рынках.

Ранее предполагалось, что Беларусь получит страновой кредитный рейтинг в текущем году, в результате чего часть дефицита бюджета будет профинансирована за счет продажи государственных ценных бумаг на западных рынках. Однако эти планы до сих пор не были осуществлены. Судя по некоторым заявлениям представителей правительства, сложности связаны именно с выбором агентства для получения рейтинга.

Ранее также предполагалось, что уже в этом году начнется продажа белорусских государственных ценных бумаг на российском рынке. Однако застопорилось и выполнение планов по выходу на фондовый рынок России.

Судя по всему, в этом году Беларусь вряд ли выйдет на внешние фондовые рынки. Ранее представители белорусского Минфина заявляли о том, что сегодня этот вопрос не является актуальным, поскольку дефицит бюджета текущего года будет профинансирован за счет привлечения дополнительных доходов (их объем к концу года, как ожидается, составит порядка 500 млрд. рублей). Заместитель министра финансов Анатолий Сверж ранее даже заявлял о том, что в связи с получением дополнительных доходов бюджета удастся снизить его дефицит до 1% от ВВП (запланированный на этот год объем дефицита составляет 1,5% от ВВП).

Дефицит бюджета в следующем году должен составить 910 млрд. белорусских рублей (1,5% от ВВП). Планируется, что источники его покрытия будут следующими. 278 млрд. — за счет размещения государственных ценных бумаг, 100 млрд. — за счет приватизации госсобственности и 523 млрд. — за счет внешнего финансирования.

По мнению экономиста **Ярослава Романчука,** *"сегодня Беларусь вряд ли может претендовать на высокий кредитный рейтинг и рассчитывать на значительный приток кредитов и инвестиций. Не исключено, что ситуация ухудшится в связи с принятием США "Акта о демократии". Внешнее финансирование, на которое можно рассчитывать сегодня, — это в первую очередь деньги, которые происходят из стран СНГ".*

("Белорусские новости".)

ЧТО ПРОИСХОДИТ В МИРЕ

Королем Камбоджи стал балетный танцор

За его кандидатуру проголосовал так называемый Тронный совет страны, состоящий из девяти человек. Единственная политическая роль, которую до сих пор была у бывшего балетного танцовщика Сиамони, — посланник Камбоджи в ЮНЕСКО.

В заявлении, распространенном Тронным советом, говорится, что королевский титул переходит Сиамони немедленно, а его коронация будет проведена до конца месяца.

На случай отречения монарха до заявления Сианука не было никаких установленных процедур. Чтобы позволить собраться Тронному совету, через камбоджийский парламент пришлось срочно проводить новые законы.

Поселенцы выступили против плана Шарона

Несколько тысяч еврейских поселенцев, живущих на палестинских территориях, провели одновременные митинги в разных районах Израиля.

В частности, около 3 тысяч еврейских поселенцев и их сторонников прошли маршем по Иерусалиму, хотя организаторы шествия надеялись на то, что собравшихся будет больше.

Участники демонстраций выражали недовольство намерением премьер-министра Ариэля Шарона вывезти около 8 тысяч поселенцев из сектора Газа и из некоторых районов Западного берега реки Иордан.

В центре Москвы зарезали трех женщин

Об этом сообщили информационному агентству РИА "Новости" в Управлении информации ГУВД столицы.

Тела 70-летней пенсионерки, ее 45-летней дочери и 45-летней подруги дочери были обнаружены в квартире дома 12 на улице Подвойского. Следов ограбления в квартире нет. Все убитые имели московскую прописку, по словам соседей, вели обычный образ жизни и не злоупотребляли спиртным.

США предостерегают власти Украины

Официальный Вашингтон выразил глубокое разочарование ходом избирательной кампании на Украине. Госдепартамент США заявил, что администрация Буша будет вынуждена пересмотреть свои отношения с властями этой страны, если те про должат нарушать демократические нормы.

Беспокойство по поводу предвыборной кампании на Украине ранее уже выражали американские дипломаты, которые Белый дом посылал в Киев. Однако последнее заявление Госдепартамента прозвучало значительно резче, чем все предыдущие. В нем открыто говорится, что нарушения в ходе кампании могут повлиять на отношения между двумя странами.

"США глубоко разочарованы тем, что нынешняя избирательная компания на Украине не соответствует международным стандартам, — сказано в официальном заявлении представителя Госдепартамента США Ричарда Баучера. — Разгон оппозиционных митингов, ограничение работы независимых СМИ, злоупотребление "административным ресурсом" и другие серьезные нарушения вызывают сомнения в приверженности украинского правительства его демократическим обязательствам".

Удар по Фаллуджи

Американская армия провела массированную боевую операцию с применением авиации и наземной техники в иракском городе Фаллуджа, находящемся в руках боевиков. По словам самих американцев, этот рейд был очередным этапом продолжающейся операции, а не попыткой взять город под свой контроль.

Нанесены авиаудары по местам, в которых, как предполагают американцы, действуют боевики группировки Абу Мусаба Заркави, уроженца Иордании, который числится под номером один в списке разыскиваемых иракскими властями. Американцы предлагают за его поимку 25 миллионов долларов.

Премьер-министр Ирака Айяд Аллави предупредил, что город и впредь будет объектом боевых операций, если его жители не выдадут Заркави, однако делегация Фаллуджи на переговорах с представители правительства заявила, что это требование невыполнимо, поскольку поймать иорданца не удается даже американским военным.

ВІНШУЕМ!

Рамуальду Кліму — 71!

Днямі свой восьмы дзесятак разменяў славуты беларускі лёгкаатлет Рамуальд Іосіфавіч Клім. Яму споўніўся 71 год.

Рамуальд Клім — чэмпіён Еўропы 1966 года, сярэбраны прызёр Алімпіды 1968 года ў Мехіка, уладальнік Кубка Еўропы 1965 і 1967 гадоў, чатырохразовы чэмпіён СССР 1967 — 1971 г.г, дзесяціразовы рэкардсмен СССР у кіданні молата, рэкардсмен свету і Еўропы. Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь.

Да сённяшняга дня Рамуальд Іосіфавіч плённа працуе ў спартыўнай галіне, рыхтуючы нашых лёгкаатлетаў да адказных стартаў, а таксама пільна сочыць за падзеямі ў спартыўнай галіне. Пра гэта можа сведчыць выступленне Рамуальда Іосіфавіча на старонках нашай газеты з ацэнкай вынікаў Алімпіяды-2004 у Афінах.

"Народная воля" зычыць імяніннiку моцнага спартыўнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця і перамог ва ўсіх яго справах.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Адной рукой дабаўляюць, другой — выграбаюць

Дзяржаўныя СМІ трубяць аб вялікім клопаце ўлады пра чалавека. БелТА паведамляе, што з лістапада павышаецца памер месячнай мінімальнай заработнай платы, якая будзе складаць 128 тысяч 390 рублёў замест 83 тысяч сённяшніх. Павышаецца размер пенсій на 10 працэнтаў. Апошні пералік іх быў у жніўні, у выніку якога яны выраслі ў сярэднім на 17,7 працэнта, а ў цэлым з пачатку года — на 39,1 працэнта.

Маўляў, во як растуць даходы працоўных, вышэй чым у іншых краінах СНД.

Вядома, добра што павышаюцца заробкі і пенсіі. Так і хочацца сказаць: эх, каб выбары ды рэферэндумы былі двойчы ў год!

Але ці сапраўды растуць даходы беларусаў? Бо растуць жа цэны і камунальныя плацяжы. А вось аб апошнім прапагандысцкія салаўі ад улады чамусьці не любяць успамінаць. Давайце зірнем на цэны і тарыфы.

За студзень-жнівень сёлетняга года ў параўнанні з такім жа перыядам леташняга жыллёва-камунальныя паслугі выраслі на 29,5 працэнта, плата за ацяпленне — на 40,3 працэнта, за карыстанне (тэхнічнае абслугоўванне) жылымі памяшканнямі — на 59,5 працэнта, праезд у пасажырскім транспарце — на 24 працэнты.

Заўважыце, пенсіі павялічыліся на 39,1 працэнта, а ацяпленне — на 40,3 працэнта, плата за кватэру (яе тэхнічнае абслугоўванне) на 59,5 працэнта. Гэта ўжо цяпер, а што будзе зімой?

Растуць і цэны. З пачатку года яны павялічыліся амаль на 20 працэнтаў і не збіраюцца спыняцца.

Атрымліваецца, што адной рукой дабавілі трохі грошай, а другой — выграбаюць іх з нашых кішэняў. Дык хіба павялічваюцца нашы даходы?

Яўген ТАЎГЕНЬ.

ПУЛЬС

Беларуска бярэ ўдзел у расійскім тэлешоу «Ты — супермадэль-2»

14 удзельніц шоу ўжо паплылі на яхце па Маскве-рацэ, дзе з імі працуюць стылісты, касметолагі, дыетолагі, фатографы і іншыя спецыялісты ў галіне мадэльнага бізнесу. Цікава, што дзяўчатам забаронена тэлефанаваць нават родным.

Удзельніц для шоу шукалі ў Расіі, Беларусі і ва Украіне. Пасля мінскага тура шанц стаць супермадэллю быў у чатырох прадстаўніц Беларусі, якіх запрасілі ў Маскву на фінальны адбор, аднак лёс усміхнуўся толькі 15-гадовай К.Андрэевай.

Пераможца заключыць кантракт на 250.000 доляраў з міжнародным мадэльным агенцтвам "Эліт Модэл".

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Кампанія «Х'юлет-Пакард» адкрыла сваю дэманстрацыйную залу ў Мінску

Адзін з вядучых сусветных пастаўшчыкоў камп'ютэрных тэхналогій кампанія "Х'юлет-Пакард" адкрыла сваю дэманстрацыйную залу ў Мінску. На ёй круглы год будуць дэманстравацца сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі ад кампаніі.

Для заказчыкаў ужо пачалі праводзіцца тэматычныя семінары, выдаецца абсталяванне для наступнага тэсціравання ва ўласным офісе. Акрамя гэтага, для партнёраў кампаніі рэгулярна праводзяцца трэнінгі па вывучэнні прадуктаў, анонсы навінак, падтрымка выставачнымі ўзорамі і рэкламнымі матэрыяламі.

Аляксей АРЭШКА.

Новая калекцыя «Мілавіцы»

Калекцыя жаночай бялізны "Мілавіца" 2005 года была прадэманстравана гандлёвым прадпрыемствам Беларусі на спецыяльным паказе ў Палацы Рэспублікі.

Была паказана класічная і модная бялізна, купальнікі. У калекцыі "Класіка" выдзелены зручная бясшоўная бялізна, трыкатажныя вырабы з бавоўны з утрыманнем лайкры і лінія "Мама" для жанчын, якія знаходзяцца ў дародавым і пасляродавым перыядах. Калекцыя "Мода" прадстаўляе серыі "Луіза", "Німфа", "Агнес", "Беатрыс", "Магія".

Асаблівасцю цяперашніх класічнай і моднай калекцый бялізны з'яўляецца выкарыстанне эластычных палотнаў з утрыманнем мікравалакна, эластычных эксклюзіўных карункаў з эфектам ручной работы, шаўкавістых і мігатлівых паверхняў палатна з набіўным малюнкам, вышыўкі макрамэ.

Лавінія АРЭШКА.

«Кубак Крамля» без беларусаў

Уладзімір Валчкоў прайграў славаку Дамініку Хрбаты — 6:4, 5:7, 6:7. У чвэрцьфінале славак можа адпомсціць расіяніну Ігару Куніцыну, які выбіў з турніра яго суайчынніка — Караля Бэка.

Як паведамляў БелаПАН, Максім Мірны і Марат Сафін па невядомых прычынах зняліся са спаборніцтваў у парным разрадзе.

Алег РАЯВЕЦ.

Канфіскавана больш за тысячу бутэлек гарэлкі

Рашэннем суда Кобрынскага раёна да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 25-гадовы жыхар райцэнтра, які нідзе не працуе. Як расказаў начальнік Кобрынскага міжрайаддзела Упраўлення дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю па Брэсцкай вобласці Андрэй Пракапук, малады чалавек быў затрыманы 7 кастрычніка. У асабістым аўтамабілі "Аўдзі-100" жыхар райцэнтра перавозіў алкагольныя напоі і цыгарэты без акцызных марак. У машыне і надворных пабудовах было знойдзена 1065 бутэлек гарэлкі пяці найменняў і 270 пачак цыгарэт трох найменняў на суму каля 3 тысяч долараў ЗША.

Тавар быў канфіскаваны, а ў дачыненні да падпольнага бізнесмена складзены два адміністрацыйных пратаколы. Рашэннем суда канфіскаваны тавар вернуты ў даход дзяржавы, а нелегальны прадпрымальнік прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў памеры 760 тысяч рублёў.

Ларыса ШЫГАНАВА.

ЗАДУМАЕМСЯ...

Мы ўсе з трушчобаў?

Проста дзіву даешся, якія нахабныя гэтыя мексіканцы. Сваё жыллё яны называюць трушчобамі. Варта толькі паглядзець іхні серыял і адразу пераканаешся ў гэтым. Калі мераць іхнімі меркамі, то мы ўсе з трушчобаў. За рэдкім выключэннем. І думаю, што многія з нас згадзіліся б памяняцца ўмовамі жыцця з імі. Бачылі ў кіно, якая ў самай звычайнай мексіканскай кватэры абстаноўка? У пярэднім пакоі стаіць паўкруглая канапа. Я акурат такую бачыла нядаўна ў адным з мінскіх магазінаў, дзе прадаецца дарагая мэбля. Яна там абгароджана вяровачкай, каб хто ненарокам не ўздумаў сесці. Людзі стаялі ля вяровачкі і пазіралі на канапу, як на музейны экспанат.

— Будзеце купляць? — з грэблівай усмешкай на твары спытаў вярзіла-назіральнік, у кожнай далоні якога магло б змясціцца па спальным вагоне міжнароднага поезда Масква—Дзюсельдорф.

— Заўтра, — кажу я. — Сёння кніжку чэкавую дома забылася.

Ён кіўнуў і выраўняў усмешку: усё было зразумела.

Ля канапы праходзілі настаўнікі, урачы, кваліфікаваныя рабочыя, пра якіх пішуць "залатыя рукі", але ніхто не меў столькі грошай, каб купіць гэты тавар. А там у сям'і працуе адна гаспадыня. Ды і работа ў яе простая: то мые для людзей бялізну, то прасуе. А ў доме ёсць і халадзільнік, і тэлевізар, і дабротная мэбля. А якая ў іх спальня! Божа мой, якая ў іх спальня...

Не, сапраўдныя трушчобы гэта ў нас. Зайдзіце вечарам у рабочыя інтэрнаты: там часта на лесвіцах няма ніводнай лямпачкі. Расказвала мне знаёмая бабулька, якая аднойчы ў цёмны час сутак хадзіла ў такі інтэрнат да ўнучкі.

— Спускаюся гэта я па лесвіцы, а насустрач — дзяцюк. Падхапіў мяне ў абдымкі і папёр назад.

— Ох, ты мая Дзюймовачка, якая лёгенькая, — прамовіў з замілаваннем. Але калі ўзвалок на другі паверх і пры цьмяным святле ўбачыў сваю памылку, сказаў:

— Божы адуванчык, таму і лёгенькая. А я думаў Дзюймовачка.

Раней па абавязку службы мне часта даводзілася сустракацца з людзьмі, якія ў свой час па розных прычынах пакінулі радзіму, а потым прыязджалі сюды ў госці. Здаралася, што некаторыя не былі ў сваім краі па некалькі дзесяцігоддзяў. Ах, як жа я іх асуджала! Усімі фібрамі душы, усім жарам камсамольскага сэрца. Гэта ж трэба: радзіму пакінулі, калгасаў не стваралі, камунізм не будавалі, а цяпер прыперліся паглядзець на нашы поспехі ды пазайздросціць.

На такія сустрэчы звычайна ездзіла з прадстаўнікамі органаў бяспекі. Па першым іхнім званку ўнутрана падцягвалася, як, прабачце, кавалерыйскі конь пры гуку паходнай трубы. Заўсёды была гатова кляйміць ганьбай гнілы капіталізм і ўсхвальваць наш, савецкі, лад жыцця — самы шчаслівы ў свеце.

Пры прадстаўніках органаў гэтыя людзі спрабавалі выцягнуць са сваёй душы нешта такое, што б кідала цень на іхняе цяперашняе жыццё і ўсхваляла наша. Але ім гэта цяжка ўдавалася. У асноўным — сум па радзіме, па сваяках. Не спяшаліся ганьбаваць свой капіталізм. Вядома ж, думала, зайздросцяць нам.

Прыязджаў аднойчы ў Дзятлава чалавек з Канады. Мы прызначылі яму сустрэчу ў міліцыі. Памятаю, усё спрабавалі высветліць, які ў яго дом.

— Стары прадаў, купіў новы, аддаў за яго сто тысяч долараў, — даводзіў ён. Але наша ўяўленне ніяк не малявала дом за сто тысяч долараў. Не разумелі і ўсё тут. Пачалі з другога боку.

— Ну вось ваша швагерка нядаўна атрымала новую добраўпарадкаваную кватэру. У вас такое жыллё ці лепшае?

— У нас такога жылля, як у швагеркі, наогул няма, — грэбліва скрывіўся ён.

На адзін з аддаленых хутароў прыехала з "гнілога" Захаду жанчына ў госці да старэйшай сястры. Некалі з родных мясцін вывезлі ўсю іхнюю сям'ю, бо бацька быў леснікам. А старэйшая сястра ўжо была замужам і яе не чапалі. Мне сказалі, што госця пажылая. І калі да нас з суседняга пакоя выйшла стройная жанчына ў элегантным бручным касцюме, я была шакіравана.

Аднойчы давялося паехаць на сустрэчу з амерыканскім госцем без прадстаўнікоў органаў бяспекі. Мы былі ў пакоі адны. І тое, пра што гаварыў гэты чалавек, мяне проста жахнула. Ён сказаў, што мы тут не жывём, а існуем, што мы ніколі не дагонім іхнюю краіну, як бы ні стараліся. І не толькі іхнюю. Маўляў, наша дзяржава безнадзейна адстала ад цывілізаванага свету.

Я была абурана. А ён сказаў:

— Гэта чыстая праўда. Напішаце пра гэта?

Яшчэ чаго! Я была шчыра ўпэўнена, што ўсё гэта правакацыя, чорная зайздрасць да нашага савецкага ладу жыцця.

Не верылася, што ў іх усё так, як расказваюць. Не хацелася верыць. Ну, хіба можна было пагадзіцца з тым, што расказваў адзін уладальнік майстэрні з той жа Канады. Ён займаўся рамонтам дахаў. У яго свая тэхніка, наймаў рабочых.

— А калі часам у чалавека вытворчая траўма, што тады? — дапытвалася я.

— Прымаючы чалавека на работу, я заключаю дагавор са страхавой кампаніяй. І ў выпадку чаго ён мае справу з ёй.

— І былі няшчасныя выпадкі?

— Аднаму рабочаму адбіла мізінец на левай руцэ. Нядаўна.

— А колькі ён атрымаў пенсіі?

Госць прыжмурыў вока, нешта палічыў і сказаў:

— На вашы грошы больш як 240 рублёў.

Я, вядома, не паверыла. Ды хіба можна ў такое паверыць, калі мой муж, атрымаўшы вытворчую траўму і страціўшы дзве трэці нагі, атрымліваў тады ўсяго 15 рублёў пенсіі. У яго была толькі трэцяя група інваліднасці.

Так хочацца, каб і наш народ жыў шчасліва, годна, каб дабрабыт быў не на словах, а на справе. Пашлі нам, Божа, Мір, Шчасце і Праўду.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

ДАЛЁКАЕ—БЛІЗКАЕ

Папярэджанне, якога не пачулі

Сяргей НАВУМЧЫК

Апошнім часам даводзіцца чытаць заклікі "не ўвязваць Быкава ў палітыку" ды папрокі ў імкненні "расцягнуць імя вялікага пісьменніка па партыйных офісах". Бясспрэчна, Быкаў належыць усяму народу, а ягоныя літаратурныя творы — Вечнасці. Што да партый, дык за ўсё сваё жыццё Быкаў быў толькі ў адной палітычнай арганізацыі — у БНФ. На прэзідэнцкіх выбарах 1994 года ён падтрымаў Зянона Пазьняка, пабачыўшы ў ягоным абранні адзіны шанц для Беларусі. Гэта быў свядомы і асэнсаваны выбар. Замоўчваць гэтыя факты ў быкаўскай біяграфіі — па меншай меры, несумленна. Адсякаць лёс Быкава ад падзей, якімі жыў беларускі народ, — значыць спрашчаць, прымітызаваць ягоную асобу.

Артыкул, які сёння друкуе "Народная воля", Васіль Уладзіміравіч перадаў мне 28 лютага 1996 года, у кватэры на Танкавай. Не памятаю, чаму ён даў артыкул менавіта мне — мо таму, што я быў адным з "герояў" фільма, які пракруцілі па расійскім тэлебачанні. А можа, ведаў пра нашы сяброўскія адносіны з Аляксандрам Старыкевічам, тагачасным карэспандэнтам "Ізвестий" па Беларусі (Быкаў вырашыў выступіць у "Известиях", і таму напісаў па-расійску). Аляксандар адразу пераслаў артыкул у рэдакцыю, але ў Маскве ён быў парэзаны і скарочаны ўдвая. Сёння ён упершыню друкуецца ў поўным, арыгінальным варыянце.

Варта прыгадаць палітычны кантэкст таго часу.

Русіфікацыя краіны, якую Лукашэнка распачаў адразу ж пасля прыходу да ўлады, магла рэалізавацца пры выкананні двух умоваў, мэтаў. Трэба было, па-першае, зламаць маральны дух народа, зняважыць яго, фактычна пазбавіўшы права на родную мову ды скасаваўшы дзяржаўныя сімвалы — "Пагоню" і бел-чырвона-белы сцяг. Па-другое, выціснуць на палітычную перыферыю БНФ — тую галоўную сілу, якая ўзначаліла нацыянальнае Адраджэнне. Менавіта таму ў 1995 годзе і былі сумешчаны парламенцкія выбары і рэферэндум. 12 кастрычніка дэпутаты БНФ былі збітыя ў Авальнай зале, а праз некалькі дзён на тэлеэкраны выйшаў фільм Ю.Азаронка "Дзеці хлусьні", дзе ў якасці галоўных персанажаў былі выведзеныя Зянон Пазьняк, Юры Хадыка, Алег Трусаў, Мікола Статкевіч і аўтар гэтых радкоў. Агучваўся фільм голасам У.Гасцюхіна (з'явіўся ён і ў кадры — карміў лебедзяў, што, відаць, павінна было стварыць вобраз гуманіста, па кантрасце з "фашыстамі-нацыяналістамі"). Натуральна, актывісты нацыянальнага руху былі пададзены ў непрывабным выглядзе. Зразумела, абвергнуць паклёп па тэлевізіі ніхто з нас магчымасці не меў. Роўна як і не далі апанентам улады выказаць сваю пазіцыю па рэферэндуме (што, між іншым, было парушэннем Закона аб рэферэндуме і дазваляе лічыць яго вынікі нелегітымнымі. Калі-небудзь будучы дэмакратычны парламент скасуе іх адным галасаваннем). На тых выбарах ніхто з дэпутатаў апазіцыі БНФ у склад ВС 13-га склікання не прайшоў, і некаторыя палітолагі радасна канстатавалі смерць БНФ і заняпад нацыянальнай ідэі.

